Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Нацыянальны інстытут адукацыі

# БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ
# Ў СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

## Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў па гісторыі Беларусі для вучняў VII класа агульнаадукацыйных устаноў

Аўтар-складальнік: В. А. Варонін

Мінск 2009

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

*Актуальнасць* правядзення факультатыва абумоўлена важнасцю вывучэння айчыннай гісторыі для грамадзянскага, патрыятычнага і гуманістычнага выхавання маладога пакалення, вялікім значэннем перыяду Вялікага княства Літоўскага ў гісторыі Беларусі, якое заключаецца, у прыватнасці, у фарміраванні беларускай народнасці. Глыбокія і трывалыя веды ў галіне айчыннай гісторыі павінны дапамагчы школьнікам зразумець асноўныя заканамернасці развіцця роднай краіны ў мінулым, стаць трывалым падмуркам для разумення яе сучаснага становішча і перспектыў далейшага развіцця.

*Мэта* факультатыва: авалоданне вучнямі VII класа паглыбленымі сістэматычнымі ведамі аб гісторыі Беларусі эпохі знаходжання беларускіх зямель  у складзе Вялікага княства Літоўскага, далучэнне школьнікаў да нацыянальных, еўрапейскіх і сусветных культурна-гістарычных традыцый.

Да ліку найважнейшых *задач* факультатыва належаць:

фарміраванне ў вучняў VII класа паглыбленых факталагічных і гісторыка-тэарэтычных ведаў у галіне айчыннай гісторыі сярэдзіны XIII — сярэдзіны XVI стст.;

сістэматызацыя ведаў па айчыннай гісторыі сярэдзіны XIII — сярэдзіны XVI стст.;

развіццё пазнавальных схільнасцей, творчых пачаткаў і інтэлектуальных здольнасцей вучняў;

развіццё ў школьнікаў крытычнага мыслення на падставе аналізу гістарычных дакументаў і іншых крыніц інфармацыі;

фарміраванне ў вучняў навыкаў і ўменняў па самастойным пошуку гістарычнай інфармацыі;

фарміраванне і развіццё ў вучняў навыкаў і ўменняў апрацоўваць і прэзентаваць атрыманыя гістарычныя веды са спасылкай на гістарычныя крыніцы і даследаванні, іншыя крыніцы інфармацыі, уласны вопыт.

Азначаныя мэты і задачы рэалізуюцца ў наступных метадах і прыёмах, накіраваных на развіццё творчай актыўнасці і пазнавальнага інтарэсу вучняў: праца з крыніцамі гістарычнай інфармацыі, пісьмовыя працы і вусныя даклады вучняў, творчыя гульні, абарона праектаў, прэзентацыя праектаў з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій, падрыхтоўка творчых работ (рэфераты, даклады, эсэ і інш.)

Праграма факультатыўных заняткаў разлічана на 35 гадзін.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### **Уводзіны** (1 гадз.)

Вялікае княства Літоўскае – шматэтнічная еўрапейская дзяржава эпохі позняга Сярэднявякоўя і ранняга Новага часу. Роля і значэнне ВКЛ у гісторыі беларускага народа. Гістарычныя крыніцы па айчыннай гісторыі эпохі ВКЛ. Перыядызацыя гісторыі ВКЛ.

### **Раздзел І. Беларускія землі ў сярэдзіне XIII–XIV стст.** (16 гадз.)

**Вытокі Вялікага княства Літоўскага.** Прычыны і асаблівасці ўтварэння новай дзяржавы ў Верхнім і Сярэднім Панямонні. Літоўскае насельніцтва ў Верхнім Панямонні. Славянская каланізацыя Верхняга Панямоння. Узнікненне ўсходнеславянскіх гарадоў і ўдзельных княстваў у Верхнім Панямонні.

**Пачатак Вялікага княства Літоўскага.** Першыя звесткі пра Літву. Летапісная Літва. Узмацненне Навагрудскага княства. Асоба вялікага князя Міндоўга. Барацьба са знешняй пагрозай. Хрышчэнне і каранацыя Міндоўга.

**Умацаванне вялікакняжацкай улады.** Ліквідацыя племянных княжанняў у Літве. Шляхі ўключэння беларускіх зямель у склад Вялікага княства Літоўскага. Княжанне Віценя і Гедыміна. Вільня – сталіца ВКЛ.

**Княжанне Альгерда. Пачатак праўлення Ягайлы.** Прыход да ўлады Альгерда. Падзел улады паміж Альгердам і Кейстутам. Усходні напрамак знешняй палітыкі ВКЛ. Барацьба Ягайлы за вялікае княжанне.

**Барацьба з крыжацкай агрэсіяй.** Тэўтонскі ордэн. З'яўленне крыжакоў у Прыбалтыцы. Асноўныя напрамкі крыжацкай агрэсіі. Стараста Давыд Гарадзенскі. Князь Андрэй Полацкі.

**Збліжэнне Вялікага княства Літоўскага з Польшчай.** Прычыны збліжэння ВКЛ і Польшчы. Характар, умовы і вынікі Крэўскага пагаднення.

**Дзяржаўны лад ВКЛ у сярэдзіне XIII−XIV ст.** Дзяржаўны лад і сістэма кіравання. Цэнтральны апарат ўлады. Мясцовыя органы ўлады. Дзяржаўная і рэгіянальная сімволіка ВКЛ.

**Гаспадарчае жыццё.** Сельскагаспадарчыя заняткі і промыслы. Прылады працы. Сельскія паселішчы. Гарады. Мястэчкі. Спецыяльнасці рамеснікаў. Рамесная прадукцыя. Унутраны і знешні гандаль.

**Этнічная і канфесійная сітуацыя.** ВКЛ – шматэтнічная дзяржава. "Літвіны" і "русіны". Роля і арганізацыя праваслаўнай царквы ў ВКЛ. Пачатак распаўсюджвання каталіцтва.

**Матэрыяльная і духоўная культура.** Архітэктура. Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Пісьменства. Народная культура. Побыт насельніцтва.

## **Раздзел II. Беларускія землі ў канцы XIV – сярэдзіне XVI ст.** (18 гадз.)

**Княжанне Вітаўта.** Барацьба Вітаўта за аднаўленне самастойнасці ВКЛ. Востраўскае пагадненне. Унутраная палітыка Вітаўта. Узмацненне

цэнтральнай улады. Вялікае княства Літоўскае на вяршыні магутнасці. Палітыка Вітаўта на Русі. Спроба каранацыі Вітаўта.

**“Вялікая вайна” і Грунвальдская бітва.** Узмацненне крыжацкай небяспекі. Падрыхтоўка да рашучага адпору крыжакам. Грунвальдская бітва. Вынікі і гістарычнае значэнне бітвы. Тарунскі мір.

**Грамадзянская вайна 1432—1439 гг.** Абвастрэнне барацьбы за ўладу паміж групоўкамі феадалаў у ВКЛ. Дзяржаўны пераварот 1432 г. Змаганне паміж Свідрыгайлам і Жыгімонтам Кейстутавічам. Бітва пад Вількамірам (1435). Завяршэнне і вынікі вайны.

**Змены ў дзяржаўным ладзе ВКЛ у XV – сярэдзіне XVI ст.** Казімір Ягелончык і яго палітыка. Рада і сойм. Вышэйшыя дзяржаўныя пасады ў ВКЛ. Адміністрацыйны падзел. Суды і заканадаўства ВКЛ.

**Унутрыпалітычнае становішча ВКЛ у першай палове XVI ст.** Выступленне М. Глінскага: прычыны, мэты і вынікі. Кансалідацыя вярхоў грамадства ВКЛ. Унутраная палітыка Жыгімонта I Старога.

**Войска і вайсковая справа ў ВКЛ.** Арганізацыя войска. Вайсковая служба. Узбраенне.

**Знешнепалітычнае становішча ВКЛ у сярэдзіне XV – першай палове XVI ст.** Страта ВКЛ першынства ў збіранні “рускіх” зямель. Адносіны з Вялікім княствам Маскоўскім. Абарона ад набегаў крымскіх татар.

**Сельская гаспадарка, рамёствы, гандаль.** Агульны стан гаспадаркі. Новыя з’явы ў сельскай гаспадарцы. Фальварак. Узрастанне значэння рамесніцкіх заняткаў. Узнікненне цэхаў. Ажыўленне ўнутранага гандлю. Змены ў структуры знешняга гандлю. Сістэма мер і вагаў. Грашовае абарачэнне.

**Развіццё гарадоў.** Колькасць і насельніцтва гарадоў. Замак і пасад. Магдэбургскае права. Гістарычная роля гарадоў. Узнікненне мястэчак. Функцыі мястэчак.

**Сацыяльная структура грамадства.** Фарміраванне саслоўяў у Вялікім княстве Літоўскім. Катэгорыі сялянства. Павіннасці, землеўладанне і землекарыстанне сялян. Этапы запрыгоньвання беларускага сялянства. Мяшчанства. Шляхецкае саслоўе, магнатэрыя. Духавенства.

**Утварэнне беларускай народнасці.** Асаблівасці фарміравання беларускага этнасу. З'яўленне старабеларускай мовы. Формы этнічнай самасвядомасці жыхароў Беларусі. Паходжанне назвы "Белая Русь".

**Этнічныя меншасці ў ВКЛ.** Шматэтнічны характар дзяржавы. Татары. Яўрэйскія абшчыны ў гарадах. Цыганы.

**Царква і рэлігія.** Палітыка дзяржавы ў адносінах да цэркваў. Становішча праваслаўнай царквы. Умацаванне пазіцый каталіцтва. Рэлігійная талерантнасць у ВКЛ.

**Культура ВКЛ у канцы XIV—XV ст.** Асноўныя мастацкія стылі. Узмацненне ўплываў заходнееўрапейскага мастацтва. Культавае і абарончае дойлідства. Жывапіс і скульптура.

**Рэнесансавая культура ў ВКЛ.** Рэнесанс і яго праявы ў культуры і штодзённым жыцці. Літаратура. Беларуска-літоўскае летапісанне. Развіццё кнігадрукавання.

**Францыск Скарына – беларускі і усходнеславянскі гуманіст і асветнік.** Жыццёвы шлях Ф. Скарыны. Погляды і друкарская дзейнасць Ф. Скарыны. Велічнасць і значэнне постаці Ф. Скарыны.

**Наш край.**

**Вынiковае падагульненне**

## ЧАКАЕМЫЯ ВЫНІКІ

У выніку вывучэння факультатыўных заняткаў вучні павінны авалодаць наступнымі ведамі і спосабамі дзейнасці:

– засвоіць паглыбленыя веды аб галоўных падзеях, з’явах, працэсах грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, рэлігійна-культурнага і этнічнага развіцця развіцця беларускіх зямель у сярэдзіне XIII – сярэдзіне XVI стст.;

– называць храналагічныя рамкі гістарычных падзей, з’яў, працэсаў, вызначаць іх перыядызацыю;

– умець працаваць з гістарычнымі картамі;

– праводзіць гістарычныя параўнанні і абагульненні;

– раскрываць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі, з’явамі;

– прасочваць сувязь паміж гістарычнымі падзеямі, з’явамі, працэсамі на Беларусі і ў свеце;

– ведаць і раскрываць значэнне спецыяльных гістарычных тэрмінаў і паняццяў.

Дасягненне азначаных вынікаў будзе садзейнічаць паспяховай здачы выпускнога экзамену па гісторыі Беларусі на ўзроўні агульнай базавай адукацыі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Анішчанка, Я. К. Беларусь у часы Кацярыны II (1772—1796). — Мінск, 1998.

2. Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. — Мінск, 1993.

3. Атлас гісторыі Беларусі, ад старажытнасці да нашых дзён. — Мінск, 2006.

4. Барока ў беларускай культуры і мастацтве. — Мінск, 2001.

5. Беларуская міфалогія. — Мінск, 2001.

6. Беларускія летапісы і хронікі. — Мінск, 1997.

7. Беларусы: у 8 т. – Мінск, 1995—2004.

8. Блинова, Т. Б. Иезуиты в Белоруссии. — Минск, 1990.

9. Бохан, Ю. М. Вайсковая справа ў Вялікім княстве Літоўскім у другой палове XIV — канцы XVI ст. — Мінск, 2008.

10. Вішнеўскі А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дапам. – Мінск, 2003.

11. Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 2 т. — Мінск, 2005—2006.

12. Гісторыя Беларусі: у 2 ч.; пад рэд. Я. К. Новіка, Т. С. Марцуля. — Мінск, 2003.

13. Голенченко, Г. Я. Идейные и культурные связи восточнославянских народов в XVI — середине XVII в. —Мн., 1989.

14. Грицкевич, А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI — XVIII вв.: Социально-экономические исследования истории городов. — Минск, 1979.

15. Емельянчык, У. П., Юхо, Я. А. «Нарадзіўся я ліцьвінам». Тадэвуш Касцюшка. — Мінск, 1994.

16. Емельянчык У. Паланез для касінераў: (З падзей паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі на Беларусі). — Мінск, 1994.

17. Лойка, П. А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI — першай трэці XVII ст. — Мінск, 2002.

18. Лыч Л. Гісторыя культуры Беларусі. — Мінск, 2008.

19. Мальдзіс А. І. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Літаратура Беларусі пераходнага перыяду (другая палова XVII — XVIII ст.). — Мінск, 1980.

20. Мысліцелі і асветнікі Беларусі: энцыкл. давед. — Мінск, 1995.

21. Мялешка В., Лойка П. І ўзняўся люд просты. — Мінск, 1992.

22. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. — Мінск, 1994.

23. Новік Я. К., Качалаў І. Л., Новік Н. Я. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў па 2008 г. — Мінск, 2008.

24. Падокшын, С. А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура (філасофска-гістарычны аналіз). — Мінск, 1998.

25. Парашкоў, С. А. Гісторыя культуры Беларусі. — Мінск, 2003.

26. Прокошина, Е. С., Шалькевич, В. Ф. Казимир Лыщинский. — Минск, 1986.

27. Рэлігія і царква на Беларусі: Энцыкл. давед. — Мінск, 2001.

28. Саверчанка, І. В. Астафей Валовіч. — Мінск, 1992.

29. Саверчанка, І. В. Сымон Будны — гуманіст і рэфарматар. Мінск, 1993.

30. Саверчанка, І. В. Канцлер Вялікага княства: Леў Сапега. — Мінск, 1992.

31. Сагановіч, Г. Невядомая вайна 1654—1667 гг. — Мінск, 1995.

32. Тарасаў, К. Памяць пра легенды: постаці беларускай мінуўшчыны. — Мінск, 1994.

33. Ткачоў, М. А. Замкі і людзі. — Мінск, 1991.

34. Францыск Скарына і яго час: энцыкл. давед. — Мінск, 1988.

35. Цітоў В. С. Этнаграфічная спадчына. Беларусь: краіна і людзі. Мн., 2001.

36. Шалькевіч, В. Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі. — Мінск, 2002.

37. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. — Мінск, 1993–2003.

38. Юхо, Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: у 2 ч. — Мінск, 2000, 2003.

## СТРУКТУРА І СКЛАД ДЫДАКТЫЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ ДА ФАКУЛЬТАТЫЎНЫХ ЗАНЯТКАЎ

1. Уводзіны.
2. Дакументы і матэрыялы, падабраныя да раздзелаў і тэм факультатыва ў адпаведнасці з праграмай.
3. Метадычны апарат: пытанні і заданні да дакументаў і матэрыялаў.
4. Вучэбная, навукова-папулярная і навуковая літаратура для вучняў.
5. Тэрміналагічны слоўнік.